БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрес: Рэдакцыі Ново-Серпухуская 29. Адміністрацыі Захароуская «Юбілейны Дом».

Рэдакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз.
У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папрауляць перасыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к

Падпіска: з дастаукай да дому у Мі[нс]ку на 1 месяц 3 руб[л].

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стран 1 руб
на апошняй—50 к п

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 91. Менск. Серада 17 ліпня 1918 г. Год

АБВЕСТКА.

Уласьніку рэстарацыі па Ільінскай вуліцы 9 пану Патэріахі дазволено трымаць рэстарацыю адчыненай усе 7 дней у тыдні.

Менск, 13 ліпня 1918 г.

Германскі Градоначальнік.

Менск 17/VII.

Земля.

«Стварэнне зямельна-парцыляцыйнаго банку, які бы меу права скупляць усю зямлю, назначэнную дзеля парцэляцыі селянскаму земляробнаму люду.

Апрацаванне зямельнаго права, якое задавольніло бы патрэбы селян і павялічыло бы адказна абшар яго землеуласцьвавання, спосабам добравольнаго выкупу, а гдзе трэба прымусоваго атчуждзення у вялікіх уласьнікау.»

У Меншчыне па перэпісі 1916 г. пахатнай зямлі:
селянскай — 1.103.440 дзес.
уласьнікау — 122.749 »

Тэрыторыя Меншчыны
займаець — 8.350.000 дзес.
пад лесам — 3.102.392 »
Сенажаці і
пашы — — 960.000 дзес.
неудобнай — 1.690.000 »
албо у %
пахатнай — 23,5
сенаж. і пашы 12,5
лесу — — 40,2
ніудобнай — 21,9

З гэтых лічб можна відзець, што толькі пятая часьць губэрні занята пахатнай культурай, пятая часьць як ніудобная, альбо балото, каторыя патрабуюць меліорацыі, альбо пры нашэй нізкай земляробнай тэхніцэ і нізкіх цэпах на прадукты, і атсутнасьці таннаго крэдыту і капіталау мы ні можэм іх выкарыстаць. Балотны спэцыяліст Авік кажэць, што нашэ Палессе, можэ заваліць усю Эуропу маслам, калі там завясьці меліорацыю балот. Клімат наш для скатоводства райскі.

Пахатнай зямлі прыватных уласьнікау усяго 122.749 дзес.

Для прырэзкі гэта малы фонд, трэба прырэзаць больш сенакосы і пашу, каторых у селян мала, і павялічываць абшар зямлі на рахунак 1.790,000 дзесяцін (21,9%) ніудобнай зямлі гэта можна зрабіць разам с падняцием з развіцием культуры Беларусі, працай усяго грамадзянскаго мэханізму.

Мобілізацыя зямлі.

К 1 студзеню 1911 г. крэсцьянскаму парцэляцыйпаму банку у менскай губэрніі прапанавана 177-ю прыватными уласьнікам і 637.865 дзес. зямлі. Банк купіу для селян з гэтаго акепу зямлі банк знайшоу падхадзячым для закупкі 384.013 д. Банк ацэнівау яе на 56 руб. дзесяціну.

Такой вялікай лічбай зямлі прапанаванпай к прадажэ Меншчына пабіла усерасійскі рэкорд. Пасьля яе ідзець Самарская губ.—613.000 д.

Там тлумачыцца гэта аграрнымі пагромамі, а у Меншчыне падпяцием селянскай гаспадаркі і накупацельнай здольнасьцю весбі, а так сама лясной спэкуляцыей. Лес прадаецца дорага, і абезлесяную зямлю прадаюць.

А. Уласоу.

Агульныя весткі.

БУКАРЭШТ, 14/VII. З Ясс афіцыяльна паведамляюць: у часе пасядзэння камэры дэпутата Стройшы прачытау ініцыятыунае прапанаванне у аднауленні абвінавацення проціу быушых міністрау Іовеля Братыяну, Вінтылы Братыяну, Екостынеску, Александру Констанцынеску, Базыль Мерцун, д-ра Ангелеску і Таке Іонеску згодна закону аб міністэрскай адпаведыяльнасьці. Пасьля прапанавання указаны абвініцельныя пункты проціу ураду, уцягнуушаго Румынію у гібельную вайну. Усе згодзіліся на гэтае прапанаванне. Згодна парадку камэры і закону аб міністэрскай адпаведыяльнасьці яно было прэдастаулено рэшэнню пасядзэння, каторае павінно будзе у хуткім часе выпоуніць усе фармальнасьці.

РОТТЭРДАМ. Агульныя ангельскія страты за месяц, паскольку яны апублікованы ангельскімі газэтамі, згодна «Ньюве Роттэрдамшэ Курант», раўняюцца 4.406 афіцэрам і 135.729 салдатам; да гэтаго трэба іпчэ дабавіць 14 афіцэраў і 304 моракаў. За 3 месяцы: красавік, май, чэрвень, страчано 21.097 афіцэраў і 337.918 салдат.

ЛУГАНО. Згодна «Аванты», у Нью-Іорку адбылося народнае сабранне у ліку 15.000 чалавек, з мэтай выяўлення пратэсту проціў умешацельства Амэрыкі у справы Расіі. Вынесяная рэзалюцыя клейміць учасьце да умешацельства у Расію як напад на апіраючаеся на давер'е усяго расійскаго народу савецкаго ураду, і выказывае, што гэткае умешацельство павінно стварыць вялікую ніпавісьць паміж расійскім народам і Амэрыкай.

БЭРН. Згодна «Пэтыт Парызьен», у Сецанві пры Салоніках, па прыгавору ваеннаго суда, растрэляны абвіняўшыеся у ўзбуджэнні ваеннаго бунту, сем унтэр-ахвіцэраў і ахвіцэраў.

ЦУРЫХ. Афіцыяльная партугальская пота паказывае згодна «Матэн», на тое, што у Ліссабоні пачаліся ніспакойствы. Справа дайшла да сільных стычак паміж прыхільнікамі і праціўнікамі сучаснаго ураду у працяг каторых забіта і ранено некалькі асоб. Пры дэмонстрацыі у Ліссабоні арэштовано паліцыяй 243 маніфэстантаў.

Весткі з Расіі.

БЭРЛІН, 14/VII. Чэхословацкія войскі, як паведамляюць бэрлінскія газэты, занялі Казань. С контынгентаў, прызваных Троцкім на ваенную службу з Уралу, Волгі і Заходнай Сыбіры, яны нібы то утварылі «Чорную гвардзію», узмацаваўшы іх уласны контынгент. Кіраўніком яе ёсьць быўшы журналіст доктар Паўлоў: палкоўнік Войцехоўскі. Вышэйшым камандным цэнтрам лічыцца, мабыць, знаходзячыйся у Харбіне англо-францускі штаб. Лік чэхословакоў цяпер даходзіць нібы то 80000, з іх 10000 згінуло у боях. «Таймс» выказывае зданне, што яны пануюць пад усім сыбірскім пуцём ад Пэнзы да Уладывастоку. Газета выказывае надзею на умешацельство Дзержаў Згоды зараз жа. У зьвязі з гэтым газэта «Фоссіпэ Цэйтунг» пазнае праз Копэнгагу, што «Ліга Бацькаўшчыны і таварышоў Дзержаў Згоды» у Парыжу пад кіроўніцтвам Ізвольскаго і Маклакова, і згрунтованы у Пекіне «Русско-Усходне - Азіяцкі Камітэт», спробуець усімі мерамі памагчы ўмешацельству у Расіі. У Японіі развілася абшырвая ваенная прапаганда, падтрымліваемая ангельскім і амэрыканскім друкам. Ужо згрунтованы муніцыоннае ведамство і ведомство ваеннаго снабжэння. Прэдстаўнік Нацыянальнаго Савету чэхо-славакоў адпраўляецца праз Токіо у Вашынгтон. У Азіяцкай Расіі чыста амэрыканскаяй місія займаецца рэарганізацыяй жалезных дарог. У Харбін ужо прыбылі ангельскія спэцыяльныя карэспондэнты.

ЖЭНЭВА, 14/VII. Згодна весткам газэты «Экcчэнж Бюро», забіўца графа Мірбаха нібы то арэштаваны.

МАСКВА. Камісарыят па міжнародным справам звярнуўся да прэдстаўнікаў Вялікабрытаніі з нотай, у каторай ён вымагае каб зараз жа забралі ангельскі атрад, высажанаго на Мурманскім ўзбярэжжы. Адпочасне камісарыят зноў паўтарае пратэст проціў стаянкі ангельскіх караблёў у Мурманскіх водах.

ШТОКГОЛЬМ. 8-го ліпня вялікая большасьць савецкаго конгрэсу прыняло прапанованае камуністычнай фракцыяй рапіэнне, у каторым сказано. 5-ый ўсерасійскі зьезд рабочых і салдацкіх дэпутатаў зусім адабрае ўнешнюю і ўнутрэнюю палітыку савета народных камісараў і зноу падм[а]цоўвае нісхілёную волю раб[о]чых і салдат ні дазволіць уця[г]нуць страну у новую вайн[у]. Савецкая Расія будзе прац[і]віцца уселякай спробе напа[]дзення на расійскую тэрыто[]рыю якога бы сабе ні был[о] імпэрыялістычнаго ураду. Савецкая Расія бязлітасна буд[зе] звертацца з ўсімі ворагамі народу, якія маняцца пакіраваць бацькаўшчыну у карысьц[ь] нацыяналістаў той ці інша[й] коаліцыі. Усерасійскі зьезд роу[]ным чынам кірує добра харча[]ную палітыку і працу камітэту бедных селян, каторыя н[] выкарыстаюць работу бедных. Працяг часу да новаго урад[]жаю ёсьць самы цяжкі для работніцкаго насялення мест і маюць прыняць самыя дзеяльныя меры дзеля спынення грамадзкай контр-рэвалюцыі і іх агентаў, якія пробуюць выкарыстаць сучаснае становішчо. Усерасійскі зьезд кліча усіх рабочых і селян шчыра пастаяць за саветы.

З Украіны.

КІЕУ. Украінскі урад прэдпрыняў патрэбныя крокі дзеля ўстанаўлення дыпламатычных адносін с савецкай рэспублікай. Урад мае згрунтоваць ва усіх вялікіх расійскіх местах кансульствы і назначыў свайго першаго прэдстаўніка для Пэнзы.

ГААГА. У аднэй з гутарак с карэспандэнтам галандскай газэты «Аллгемэйн Гандэльсблад» гэтман Скорападзкі сказау, што адным з важных заданняу есьць утварэнне супакою і парадку у краю, што і удасца с помаччу немецкіх войск. Украінская армія іпчэ ні стварылася, але ужо ідуць падгатоукі да гэтаго. У бліжэйшыя месяцы будуць адчынены школы для афіцэрау і унтэр-афіцэрау. Спадзяецца ен так-сама, што да восені будзе склікапы парлямэнт. У распараджэнне будуць прэйстаулены дзеля пабупкі селянамі 40% панскай зямлі.

Нататкі.

Народная творчасьць і новае беларускае краснөэ пісьменство.

Большая вартасьць літэратуры кожнаго пароду ёсьць у тым, насколькі выяуляецца у ёй псіхалёгія і індывідуальнасьць народнай душы. Ключ да народнай душы заўсёды ляжыць схованы у старадаўніх сказах' легэндах і песьнях, каторыя служаць самым багатым матэрыялам для прэдстаўнікаў літэратуры і штукарства кожнай нацыі.

Што тычыцца нас, беларусоў, то у новай нашай літэратуры у паэзыі ёсьць спробы у гэтым кірунку у Богдановіча, Коласа і Купалы. Але вось пачаў па гэтай часьці апрацовываць народныя творы для беларускаго тэатру п. Ф. Алеxновіч («Базылішк» і «Бутрым Няміра»).

Спад пера п. Алехновіча, як мы бачым, выходзюць сцэнічныя творы вельмі пекпыя, настроёвыя, у дэлікатна-эстэтычных тонах, пад фантастычна казачным арэолям.

«Бутрым Няміра», стаўлены у меськім тэатры 12-го ліпня, зрабіў вельмі добрае ўражэнне. Першы раз, можна сказаць, у Менску публіка бачыла у беларускім тэатры праўдзівае штукарство, вытрыманае перш-на-перш, у самой рэчы, потым у ігры і дэкарацыі (апрача грыму мараў).

Гэтай штукай можна п. Алехновіча шчыра віншаваць. А наагул пажадаем, каб і усе рэшта беларускіх драматургаў, ідучы па дарозі чыстаго штукарства і эстэтыкі, карысталі для сваіх драматычных твораў сюжэтамі нашых народных легэнд, казак і гэдак далей, як практыкавалася Шэкспірам, Ібсэнам і іншымі.

З. Б.

Уражэнні.

III *).

Вельмі часта па дарозе паміж нашымі вёскамі спатыкаюцца вялізныя будынкі.

Школы гэто, пастаўленныя, для дабра сучасьнікаў і памяці ў патомстве земскімі фундаторамі? Можа шпіталі, узнесеныя бачнымі на здароў'е убогаго насялення дабрачынцамі? Можа што небудзь дзеля намырэння і развітку культуры?—Не, гэто корчмы.

Гэто, калі хочэця, азнакі той духоўнай і матэр'яльнай культуры, якую надаваў краю істнаваўшы у ім цяпер ішчэ ні перабыты фэодалізм.

Вось першай з краю вялікай вёскі стаіць на-поў разразваліўшаяся карчма. Праваліўся у некольkіх мейсцох крыты некалі гоптам дах над стадолаю. Чорнай плямаю, Бог ведае калі расчыненыя, с пакрывіўшыміся, апаўшымі на кругох весьніцамі, сьвецяць яе вароты. На палавіну павыбіваны шыбы у вокнах, хаця відныя праз адно з іх кветкі сьведчаць, аб ні саўсім замёршым жыцці.

У сярэдзіне вёскі, праміпуўшы дзесяткі з два нівялічкіх селянскіх хат, пноў будыніна, якой, каб яна ні пачала разваліваццa, мейсцо здавалося б лепі у месьці, а пі па вёсцы. Моцны і дагэтуль ішчэ цэлы чарапічны дах. белыя, мураваныя сьцены, грубіня яспа відпеіцца у правалах быўшых некаль дзьвярэй і вокан, высокая з буйнаго камню і ані зачэпляная часам, падмуроўка,—усе паказуе што былі некалі добрыя будаўнічыя на Беларусі.

«Што было у гэтым будынку, цётачка?»—пытаюся у кабеты выглянуўшай з вакна процістоючай хаты.—«Карчма N-аго пана», атказуе кабета

—«Так, так, карчма!»—думаю і іду сабе далей. Кіпело некалі жыцце у гэтых карчмах, якімі беларускі фэодал пераймаў і праездных і прахожых, праз каторыя выбіраў і тыя нівялікія здабыткі, да якіх дарабляўся селянін у пакінутыя яму законам дні ні прыгоннай працы.

Праміпуўшы ішчэ некалькі хат, прамінуўшы убогую дрэўняную каплічку на разросшымся цвінтары—убогую і маленькую, ні глядзя на тоя, што гэто парахвіяльная праваслаўная царква—выходжу на другі край вёскі. Тутака апошняй с краю стаіць—быўшая манаполька!

Наскольki фундамэнтальныя, шырокія, багата набудаваныя корчмы напамінаюць аб панаваўшым некалі над краем фэодалу-магнаце гасьцінным пражоры, любіўшым выпіць, грубым, гарластым у бясядзе за чаркай, любіўшым паказаць сябе і пачаставаць як палежыць прошаных і ні прошаных гасьцей у сваім палацу, пастолькі гэта нівялічкая, але пакрытая жалезам, з абітым бляхай дзьвярыма, чыстая абшалеваная, з малеванымі акеніцамі манаполька, напамінае аб усё забраўшым у свае рукі нідаўна чыноўніку: сухім доўгавязым, у віц-мундзірчыку, з ястрэбінымі вачыма, з міністэрскім цыркулярам замест сэрца, с кар'ерызмам замест сумлення.

Але вартасьць першаго і другога адна. Яны стаялі над народам. Яны стваралі ні народны стан. Яны глядзелі на народ, як на быдло, катораму нічога апрача гарэліцы ні можна паказываць. Фэодальнае панство і візантыйскае самауладство стаялі па адным грунце, творучы новую Спарту у якой ілотам павінен быць увесь народ.

І яны аднальково стараючыся прывівалі яму «гарэмчаную» культуру.

«Карымскі» Шэсьціпалаў ні Аносоў—свае абіранаму імі народу, і думалі аб ім, і народ будзе аб іх лепшай памяці, чым нам аб сваіх магнатах.

Бо у нас ішчэ шляхэтны Ян чэчот асудзіў іх, кажучы пры тлумачэнні слова віннік: «Пэўне гэта назва бярэ пачатак ад віно, што па крывіцку абазначае водку, але родавод з слушнасьцю можна-б весьці ад віны, бо па праўдзі нінапраўімай віною зрабілося надмернае выганянне гарэлкі»... Літва «плаціла некалі даніну віннікамі (венікамі) для лазьні, плаціць цяпер далёка большую і гацебнейшую, дэмаралізуючыся і нішчучы уласнае здароў'е: усё гэто нібыто для брагі і навозу у дварах»*)

І. Ж.

*) Гл. № 90.

*) «Piosnki wieśniacze...» Wilno 1846.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Канцэлярыя Народнаго Сэкрэтарыяту просіць усіх чыноунікау ні маючых заняцця а так-сама і другіх асоб інтылігэнтных прафэсый, радзіушыхся на Беларусі, зарэгістравацца у канцэлярыі сэкрэтарыяту—Захароуская вул. Юбілейны дом. Дні рэгістрацыі 17, 18 і 19 ліпня гадзіны ад 10 да 12.

Старшыня Народнаго Сэкрэтарыяту прыймае, што дня, апрыч сьвят, ад 12 да $1^1/_2$ гадз. па поудні.

Адрэс: Захароуская вул. Юбілейны дом II поверх (этаж).

Апавешчэнне аб уступленні у працу новаго сэкрэтарыяту. Прэзыдыум Рады Беларускай Народнай Рэспублікі апавесціу цыркулярам ад 12 ліпня 1918 г. усе установы, беларускія арганізацыі і консульствы аб уступленні Новаго Народнаго Сэкрэтарыяту у выкананне абавязкау.

Да епархіяльнаго зьезду. Консысторыя разсылае благочынным епархіі цыркуляру аб скліканні акружных сходау духавенства дзеля выбірання дэлегатау на маючы быць у жніуні, з дазволу нямецкіх уласьцей, епархіяльны зьезд.

У зьвязі з гэтым еп. Гэоргій рэшыу ад учасьця у чарговай сэсыі усерас. царкоунаго сабору адмовіцца.

Земскае безгрошэу'е Ігуменскае павятовое земсабранне зьменьшыло расходную сьмету на 500 з лішкам тысяч рублеу пры гадавым бюджэці у 2 мільены рублеу. Дэмократычны элемэнт гласных па бюджэтнаму пытанню меу перамогу над вялікімі аграрыямі, якія тут жа на сабранні плацілі земскія зборы.

Беларускі хор пад кірауніцтвам Цераускаго мае даць для вучняу розных школ цэлую сэрыу дарэмных спэктакляу са сьпевамі і скокамі.

Да звароту мужскай гімназіі. Групай бацькау узбуджано ходатайство перад нямецкімі уласьцямі аб дазволу агульнабацькаускаго сходу па пытанню аб найхутчэйшым звароту у Менск мужскай гімназіі, эвакуаванай у 1915 г. у Маскву.

У меськай управе павялічыуся заметна наплыу налогавых грошай. Калі справа так і далей пойдзе, то пэнсію служачым за ліпень у большай часьці удасцца заплаціць, маючы пры гэтым і штомесячную гэрманскую субсыдыю.

Цэны на рынках у панядзелак, 15-го ліпня, падняліся: яйкі — $7^1/_2$—7 руб. дзесятак, квасное малако —1 р. 20 к. кварта.

Хлебны паек, па $2^1/_4$ ф. на 1 порцыю на тыдзянь мае астацца да новаго ураджаю.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоунаго камандавання за 15 ліпня 1918 року.

Захадні тэатр вайны.

Група арміяу Кронпрынца Рупрэхта.

Паудпева-захадней Іпэрна пасьля сільнай падгатоукі учора раніцай вораг пайшоу у наступленне і на нівялікім фронці прабрауся у нашыя лініі. На абэдвух бакох Ліса артылерыйская дзеяльнасьць увесь дзень. У вечары яна ажывілася і на рэшці фронта.

Група арміяу Гэрманскаго Кронпрынца.

Між рэкамі Эн і Марнай ажыуленная баевая дзеяльнасьць. Мейсцовыя пешыя стычкі паудневей Сэн—Піерра—Эглы у ушчэллі Савьер.

Лейтэнант Левенгардт меу скаю 25 перамогу у паветры.

Першы Генэрал-кватэрмэйстар **Людэндорф.**

Беларускае школьніцтво.

Гімназія у м. Будславе.

У Будславе Вілейскаго павету сьвяткавалі закладзіны падмуроуку пад дроўняны будынак беларускай гімназыі для навукі дзеўчат побач з хлопцамі. Гімназыя гэта атчынена была стараннем грамадзяніна Эдуарда Будзько і мясьцілася ў цесным, нівыгодным і зусім ніадпаведным прыватным дому.

Заложаны будынак будзе мець дзьве кандыгнацыі—пры зямле і адзін поверх.

На прызямлю запроэктованы гэтакія намяшчэнні: 1) двое уходных сенцаў каля 4,50 квадратных мэтраў, 2) вопратня для вучнаў каля 47 кв.м., 3) рэкрэацыйная саля каля 115 кв. м., 4) тры клясы каля 38 кв. м. кожная, 5) канцэлярыя каля 21 кв. м. 6) пакой для вучыцелёў каля 21 кв. м., 7) пакой с кухняй для стоража каля 28 кв. м., 8) дзьве клеткі для ўсходаў па поверх і пад страху каля 16 кв. м. кожная і 9) сенцы ў панадворак; а ўсяго падлогі па прызямлю каля 392 кв. м. На поверху памешчаюцца: 1) рэкрэацыйная саля. 2) тры клясы каля 38 кв. м. кожная, 3) габінэт-музэй каля 47 кв. м., 4) бібліотэка каля 21 кв. м., 5) пакой для вучыцелек каля 21 кв. м. і 6) кватэра—два пакоі з кухней каля 42 кв. м., а ўсяго падлогі на поверху каля 351 кв. м. Вышыня памяшчэнняў па прызямле і поверху па 3,50 м. ад падлогі да столі. У цэласьці будынак становіць 3.392 кубічных мэтраў, лічучы ад поверху зямлі да застрэшыны. Кошт будоўлі па цэнах да ваеннаго часу пацягнуў-бы каля 30 тысячаў рублёў, што будзе каштаваць пры ністаласьці цяперашніх цэн—зрабіць падрахунак—німа способу.

Усё-ж такі будынак гэны будзе тымчасовы, бо зьмясьціць у ім усёй гімназыі будзе нельга. І калі пройдзе ваенная завіруха, а жыццё усталіцца нормальна трэбаж будзе гімназыяльны гмах, мурованы найлепш для свайго цэлю прыспасоблены, трымаючыся апошняго слова будоўлянай гігіены і тэхнікі.

Архітэктар **Л. Дубейкоускі.**
15.VII 18.

Рэдактар **А. Прушынскі.**
Выдавецтво **«Т-во Заранка.»**

Друкарня Я. А. Грынблята